Рассматривая опыт проведения «Сезона олимпиад по бухгалтерскому учету», проводимых кафедрой «Учетные системы и технологии бизнес-менеджмента», можно отметить, что для участия в них приглашаются все студенты, изучающие соответствующие дисциплины, без учета критерия успеваемости. По нашему мнению, участие в олимпиадах позволяет каждому студенту получить «соревновательную» практику, попробовать свои силы в умственных соревнованиях, сопоставить собственные знания и достижения в определенной профессиональной области с успехами одногруппников, что впоследствии во многих случаях повышает заинтересованность у студента к овладению новыми знаниями по учебному предмету.

Таким образом, можно отметить, что предметные олимпиады позволяют сформировать дополнительную заинтересованность у студентов к изучению дисциплины, а также расширить их кругозор и развить интеллектуальные способности.

### Список литературы

1 **Болдовская, Т. Е.** Предметная олимпиада в структуре профессионального воспитания образовательного процесса вуза / Т. Е. Болдовская, М. В. Девятерикова // Методика преподавания математических и естественно-научных дисциплин: современные проблемы и тенденции развития : материалы VIII Всерос. науч.-практ. конф. / Омский гос. ун-т им. Ф. М. Достоевского. – Омск, 2021. – С. 7–11.

2 **Диких, Э. Р.** Олимпиада – праздничное приобщение к профессии // Э. Р. Диких, В. В. Лоренц, Л. В. Федяева // Вестник Омского государственного педагогического университета. Гуманитарные исследования. – 2015. – № 5. – С. 66–69.

3 **Савченко, Е. А.** Профессиональное образование и воспитание студентов в ходе организации и проведения олимпиад, конкурсов, круглых столов / Е. А. Савченко // Педагогическое образование и наука. – 2017. – № 2. – С. 43–45.

Получено 24.02.2025

УДК 821.161.09

## ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ВАЕННАЙ ПРОЗЫ І. НАВУМЕНКІ

*А. У. ЯРМОЛЕНКА*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, г. Гомель*

Патрыятычнае выхаванне адыгрывае важную ролю ў сацыяльным і духоўным развіцці чалавека. Яно выступае асноўным элементам светапогляду асобы ў адносінах да роднай краіны, іншых нацый і народаў. Толькі з

дапамогай пачуцця патрыятызму і павагі да нацыянальных святынь ўмацоўваецца любоў да Радзімы, з'яўляецца пачуццё адказнасці за яе магутнасць і незалежнасць, захаванне матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, развіваецца высакароднасць і годнасць асобы.

Патрыятычнае выхаванне ажыццяўляецца ў працэсе выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» на матэрыяле беларускай ваеннай прозы XX стагоддзя. Аналіз тэкстаў беларускіх пісьменнікаў дапамагае прывіць беражлівыя адносіны да гісторыі Айчыны, да яе культурнай спадчыны, да звычаяў і традыцый народа – любові да малой радзімы, да сваіх родных мясцін. Вывучэнне ваеннай прозы спрыяе выхаванню гатоўнасці да абароны Радзімы, фарміраванню ведаў пра подзвіг беларускага народа ў час вайны.

Патрыятызм вызначаецца як духоўны здабытак асобы, які характарызуе вышэйшы ўзровень яе развіцця, усвядомленую дзейнасць грамадзяніна на карысць Радзімы, народа, дзяржавы. У праграме патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гады [1] вызначаны асноўныя напрамкі па фарміраванню каштоўнасных арыенціраў, патрыятызму і грамадзянскасці моладзі ў сферы сацыяльнага, культурнага, ідэалагічнага і духоўнага развіцця. На занятках па беларускай мове ў вышэйшай навучальнай установе магчымая рэалізацыя задач развіцця гарамадзянскасці з дапамогай выкарыстання спадчыны класіка беларускай літаратуры І. Навуменкі.

Перш за ўсё ваенная проза І. Навуменкі спрыяе фарміраванню нацыянальнай ідэнтычнасці асобы. Проза пісьменніка звязана з падзеямі вайны 1941–1945 гадоў. Вайна ўварвалася ў жыццё І. Навуменкі ў самым раннім узросце. Па сведчанню даследчыкаў, Навуменка актыўна ўключыўся ў барацьбу з нямецкімі захопнікамі. Ён стаў адным з арганізатараў падпольнай маладзёжна-камсамольскай арганізацыі. Яго сябры і аднадумцы вывешвалі адозвы, збіралі разведвальныя звесткі для партызанаў, шкодзілі фашыстам. Пасля гэтага пісьменнік пайшоў на фронт. Таму тэме вайны ён прысвяціў большасць сваіх апавяданняў, аповесцей і раманаў. Непасрэдны сведка Вялікай Айчыннай вайны, аўтар апісвае подзвігі герояў партызанскіх і франтавых дзеянняў.

Па-другое, вывучэнне мастацкай творчасці пісьменніка дапамагае духоўна-маральнаму ўдасканаленню асобы. Раманы І. Навуменкі пра вайну захоўваюць духоўныя, гістарычныя і культурныя каштоўнасці беларускага народа. Яны вучаць мужнасці, стойкасці, узаемадапамозе і рашучасці. Аўтар прапагандуе сямейныя каштоўнасці як аснову традыцыйнага светаўспрымання беларусаў. Пісьменнік адлюстроўвае падтрымку і клопат сям'і, праявы ўвагі і ўдзелу ў жыцці адзін аднаго. Ён асэнсоўвае сямейную дапамогу не толькі як фізічную, але і як эмацыянальную падтрымку ў цяжкія моманты, увагу да пачуццяў і перажыванняў кожнага члена сям'і.

Па-трэцяе, творчасць пісьменніка актуалізуе інфармацыю пра гісторыка-культурнае развіццё краіны. Мастацкія творы І. Навуменкі папулярызуюць і захоўваюць нацыянальную гісторыка-культурную спадчыну Рэспублікі Беларусь, расказваюць пра злачынствы фашыстаў і іх пасобнікаў у час Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар адлюстроўвае масавае і зверскае знішчэнне людзей, якое ў гады вайны здзяйснялі нацысты на тэрыторыі Беларусі, варварскае разбурэнне матэрыяльных, культурных і навуковых каштоўнасцяў.

У чацвёртых, раманы І. Навуменкі пра вайну непасрэдна звязаны з грамадзянска-патрыятычным выхаваннем моладзі. Творы пісьменніка дапамагаюць асэнсаваць подзвіг беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны, сведчаць, што не будуць забыты шматлікія ахвяры вайны. Пісьменнік паказвае, што народ Беларусі не скарыўся акупантам, амаль з кожнай сям'і нехта загінуў, многія пазбавіліся здароўя, жылля, маёмасці. Творы І. Навуменкі адлюстроўваюць, што памяць пра родных, якія загінулі на вайне, і пачуццё глыбокай удзячнасці да пакаленняў, перажыўшых вайну, жыве і будзе жыць у душы нашчадкаў. Дзеці і ўнукі тых, хто прайшоў цяжкімі дарогамі вайны, не шкадуючы жыцця, змагаўся з ворагам, могуць ганарыцца дзядамі і бацькамі.

У пятых, гістарычны вопыт, асэнсаваны ў творчасці пісьменніка, дапамагае ваенна-патрыятычнаму выхаванню. Пісьменнік паказвае сутнасць службы салдата, будні вайны і кошт страт. Прадметам роздумаў аўтара становіцца лёс асобы на вайне. Пільная ўвага да пакутаў і смерці, натуралізм апісанняў ваеннай прозы дапамагаюць адчуць і ўсвядоміць боль за чалавека, які апынуўся ў жорсткіх умовах вайны. У творчасці І. Навуменкі акцэнт зроблены на выяве ўнутранага свету герояў і праламленні ў ім вопыту вайны, на перадачы працэсу складанага маральнага выбару чалавека.

Такім чынам, выкарыстанне ваеннай прозы І. Навуменкі на занятках па беларускай мове стварае магчымасць для фарміравання і развіцця патрыятычнага светапогляду асобы. Творы пісьменніка расказваюць пра нацыянальную ідэнтычнасць, духоўна-маральныя каштоўнасці грамадства, гісторыка-культурную спадчыну краіны. Раманы І. Навуменкі пра вайну спрыяюць грамадзянска-патрыятычнаму і ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі, сведчаць пра подзвіг беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны, захоўваюць культурную памяць грамадства.

**Спіс літаратуры**

1 О Программе патриотического воспитания населения Республики Беларусь на 2022–2025 годы / Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – 2003–2025. – ULR: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100773 (дата обращения: 11.02.2025).

Получено 11.02.2025